**М.А. Каралькоў**

## *Мастацкі вобраз як дыялектычна супярэчлівае адзінства аб'екта і суб'екта*

У гісторыі эстэтычнай думкі праблема мастацкага вобраза заўсёды мела вялікае значэнне. У наш час цікавасць вучоных да гэтай праблемы не прыпыняецца. Разнастайныя плыні — абстракцыянізм, ташызм, сюррэалізм, а таксама поп-арт, оп-арт, дадэкафонія і канкрэтная музыка, тэатр абсурду і іншыя навамодныя з'явы авангардысцкай творчасці, якія быццам бы прыйшлі ім на змену, а таксама мастацтва постмадэрнізму, разбураюць вобразную прыроду мастацкай творчасці. Тэарэтычным абгрунтаваннем такой практыкі з'яўляюцца шматлікія намаганні аб'явіць само паняцце вобраза ўстарэлым і быццам бы не адпаведным ні характару мыслення сучаснага чалавека, ні духу сучаснага мастацтва.Так, напрыклад, амерыканскі даследчык Хантэр Мід імкнуўся даказаць, што вобразнасць не з'яўляецца сутнасным паказчыкам мастацтва. Больш таго, па словах Міда, вобразнасць архаічная і не патрэбная сучаснаму мастацтву, таму што з'яўляецца мовай мастацтва натуралістычнага (1). Другі амерыканскі вучоны Петэр Бланк у артыкуле "Мастацтва і атам" сцвярджае, быццам бы сучасная навука сведчыць аб тым, што "мы жывём у свеце прывідаў настолькі абстрактных, што становіцца немагчыма сфарміраваць якую-небудзь духоўную карціну таго, што сапраўды ёсць"(2).

Заслугоўвае ўвагі той факт, што нават у працах, якія дэкларуюць адказ ад вобразнай прыроды мастацтва (напрыклад, у выходзячым у Балтыморы (ЗША) эстэтычным і мастацка-крытычным часопісе), даюць аб сабе знаць іранічныя адносіны да такіх уяўленняў.

Дакладна вядома, што ў сучасных умовах абгрунтаванне мастацкага вобраза мае не толькі тэарэтычны інтарэс, ахоплівае не толькі галіну мастацкай творчасці, але і набывае практычнае значэнне ў вырашэнні праблем эстэтычнага выхавання сродкамі мастацтва.

Філасофскай асновай тэорыі мастацкага вобраза з'яўляецца дыялектычна-матэрыялістычная тэорыя пазнання. Высвятляючы сутнасць мастацкага вобраза, мы зыходзім з тэорыі адлюстравання, якая разглядае

чалавечую свядомасць у цэлым як вобраз акружаючай нас рэчаіснасці, як суб'ектыўную карціну аб'ектыўнага свету.

Як вядома, тэорыя адлюстравання раскрывае заканамернасці сферы чалавечага ўсведамлення ў цэлым. Яна абгрунтоўвае ў той жа час і спецыфічныя заканамернасці мастацкага засваення свету, вобразнага бачання і ўзнаўлення яго сутнасці. Але філасофская трактоўка вобраза не раўназначная эстэтычнаму яго разуменню. Таму неабходна размежаванне паміж філасофскім і эстэтычным абгрунтаваннем вобраза .

Тэорыя пазнання дыялектычнага матэрыялізму карыстаецца паняццем "вобраза" ў шырокім гнасеалагічным сэнсе слова. Для тэорыі адлюстравання вобраз раўназначны копіі, як бы духоўнаму фотаздымку рэчаіснасці. Калі філосаф карыстаецца паняццем "вобраз", ён высвятляе перш за ўсё другараднасць свядомасці, адлюстраванне ў ёй навакольнай рэчаіснасці. З пункту гледжання гнасеалогіі, вобразамі з'яўляюцца разнастайныя праявы псіхічнага жыцця: адчуванне, уяўленне, разуменне, разважанне і інш.

Паколькі мастацкія вобразы з'яўляюцца вызначанай формай адлюстравання рэчаіснасці, для іх філасофскай характарыстыкі гэта вызначэнне — "суб'ектыўная карціна аб'ектыўнага свету" — цалкам захоўвае сваю сілу.

Але для тэорыі мастацкага вобраза гэтае рашэнне мае значэнне зыходнага палажэння, эстэтычны ж змест паняцця "вобраз" адносіцца да філасофскага як спецыфічнае да універсальнага. Мастацкі вобраз у больш строгім сэнсе не проста гнасеалагічная, але і эстэтычная катэгорыя. Бо размова ідзе не толькі аб вытворнасці вобразнага мыслення, а і аб выяўленні асаблівасцей мастацкага адлюстравання рэчаіснасці, яго адметных асаблівасцей, той яго спецыфічнасці, якая і вызначае яго сярод іншых формаў адлюстравання жыцця, адрознівае ад мыслення лагічнага. Эстэтыка, у адрозненне ад філасофіі, пераносіць цэнтр цяжару не на ўдакладненне таго, што ***зближае*** мастацкі вобраз з іншымі катэгорыямі свядомасці — з паняццем, разважаннем і іншым — а наадварот, на тое, што ***вызначае*** яго сярод іх.

Галоўнай асаблівасцю мастацкага вобраза з'яўляецца яго індывідуальная адметнасць. Кожны мастацкі вобраз выступае ці як канкрэтнае выяўленне тых або іншых з'яў рэчаіснасці, ці як выражэнне

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

пэўных з'яў духоўнага жыцця чалавека, ці пераплятае і звязвае паміж сабой і тое, і другое.

Але пры гэтым у ім не проста прадстаўлены пэўныя індывідуальныя рысы той або іншай жыццёвай з'явы ці цэлых груп з'яў, а раскрываюцца агульныя істотныя рысы і заканамернасці, якія ляжаць у іх аснове. Індывідуальнае ў мастацтве адрозніваецца ад фактаў самога жыцця. У ім узноўлена жыццё, узбагачанае фантазіяй мастака. Але ж справа не толькі ў гэтым. Індывідуальнае — гэта факты жыцця, быццам бы "выпраўленыя" мастаком такім чынам, каб непатрэбныя дэталі не засланялі разумення галоўнага і сутнаснага. У індывідуальным раскрываецца агульнае. М.Горкі пісаў, што факт, узяты сам па сабе, мае малое значэнне. Ён набывае значэнне толькі тады, калі выступае менавіта як вынік абагульнення. Агульнае і тыповае не антыподы, хаця гэтыя паняцці і не адно і тое ж. Індывідуальнае ў мастацтве — гэта мастацкае аднаўленне тыповага ў жыцці. Без глыбокай індывідуалізацыі, якая па-рознаму ажыццяўляецца ў розных відах творчасці, немагчымыя абагульненне, тыпізацыя.

У кожным мастацкім вобразе — канцэнтрацыя агульнага і сутнаснага ў прыватным і адзінкавым. Гэтая канцэнтрацыя і стварае тып. Тыповае ў мастацтве і ёсць адзінства абагульнення і індывідуалізацыі.

Мастацкі вобраз уключае ў сябе арганічнае адзінства аб'ектыўнага і суб'ектыўнага. Пад аб'ектыўным у вобразе маецца на ўвазе ўсё тое, што непасрэдна ідзе ад рэчаіснасці; пад суб'ектыўным — тое, што ўносіцца ў вобраз творчай думкі мастака. Аб'ектыўнае — гэта ўзнаўляючыя з'явы рэчаіснасці, карціны самога жыцця, характары, канфлікты, абставіны, духоўны свет чалавека — іншымі словамі, усё тое, што існуе апрача свядомасці мастака. Суб'ектыўнае — гэта перажыванні, разважанні мастака, яго адносіны да выяўленчых з'яў, ацэнка гэтых з'яў, асабістае іх бачанне. Кожны мастацкі вобраз уяўляе сабой не толькі адлюстраванне абагульняючых кавалкаў жыцця, але ў пэўным сэнсе і своеасаблівы аўтапартрэт мастака. За вобразам заўсёды стаіць яго творца. Суб'ектыўнасць — паказчык самастойнасці і арыгінальнасці мастака.

Адыход ад рэалізму можа выражацца як у ігнараванні аб'ектыўнага, так і ў прыніжэнні суб'ектыўнага ў вобразе. Скажэнне аб'ектыўнага, нежаданне ці няўменне лічыцца з логікай жыццёвага матэрыялу вядзе да разнастайных праяў фармалізму, што асабліва моцна сказваецца ў сучасным буржуазным мастацтве. Слабае праяўленне суб'ектыўнага

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

пачатку ці тым больш адсутнасць суб'ектыўнасці азначаюць натуралістычнае фатаграфаванне. Як і ў першым, так і ў другім выпадках разбураецца вобраз, знікае ці аслабляецца яго ідэйна-эстэтычнае значэнне.

Як супрацьлегласць матэрыялістычнай тэорыі адлюстравання фармалістычная эстэтыка вылучыла палажэнне: мастацтва не адлюстраванне жыцця, а самавыражэнне мастака. Паняцце "самавыражэнне" дыскрэдытавана дэкадэнтамі, таму што ў іх разуменні яно азначае незалежнасць мастака ад жыцця і абвяшчэнне абсалютнай самастойнасці вобразнага мыслення.

Матэрыялістычная эстэтыка адхіляе такую інтэрпрэтацыю мастацтва. Вобраз — гэта, безумоўна, не проста "самавыражэнне", незалежная ад знешняга свету "плынь свядомасці" мастака, а перш за ўсё па-мастацку ўзноўленая карціна аб'ектыўнага жыцця. Зразумела, што ў змест твора ўваходзіць і самавыражэнне мастака, якое без яго немагчымае. Больш таго, часам твор уключае ў сябе нават аўтабіяграфічныя элементы. Але ж гэта не азначае, што сацыяльны сэнс і змест твора да іх зводзяцца ці імі замыкаецца. Такі падыход значна абмяжоўвае, збядняе і, па сутнасці, скажае сутнасць твора.

Тэорыі "самавыражэння" даюць неадпаведнае рэальнасці ўяўленне аб сутнасці мастацкай творчасці і грамадскага значэння мастацтва. Але гэта, безумоўна, не сведчыць аб тым, быццам у творы мастацтва не аб'ектывізуюцца думкі і пачуцці мастака. Калі мастацкае бачанне жыцця не ўключае ў сябе багацця душэўнага жыцця свайго творцы, вобраз збядняецца, губляе арыгінальнасць і індывідуальнае аблічча, аслабляецца ў сваім ідэйным гучанні. Больш таго, розныя мастакі, звяртаючыся да адных і тых жа з'яў, да адной і той жа тэмы, ствараюць часам непадобныя вобразы, розныя творы: кавалак жыцця адзін, а ідэйна-эстэтычнае асэнсаванне рознае. У гэтым заканамернасць вобразнага адлюстравання, якое праяўляецца ва ўсіх эпохах і ва ўсіх відах творчасці. Таленавітыя мастакі заўсёды ствараюць па-рознаму.

Суб'ектыўнасць мастака, яго ідэйна-эстэтычныя пазіцыі, яго творчая актуальнасць абгрунтоўваюцца галоўным чынам яго светапоглядам. Больш таго, суб'ектыўнасць мастакоў уяўляе сабой "прадукт эпохі", сацыяльнай структуры грамадства, вызначаных псіхалогіі і ідэалогіі. У суб'ектыўнасці светапогляд мастака знаходзіць сваё эстэтычнае ўвасабленне.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Суб'ектыўнасць мастака знаходзіць сваё выражэнне ў яго індывідуальнай творчай манеры, у стылявых асаблівасцях. "Кожны вялікі мастак, — пісаў Стэндаль, — шукаў прыёмы, якія б маглі выклікаць у душы тое асаблівае ўражанне, якое ўяўлялася яму галоўнай мэтай жывапісу"(4). Стэндаль меў рацыю, калі казаў, што адчуць, напрыклад, стыль Рафаэля — гэта значыць, знайсці ў яго святлаценi, малюнку і каларыце асаблівы тон яго душы.

Адметны тон душы адрознівае творчасць любога мастака — гэта справядліва і тады, калі мы сутыкаемся з мастакамі, у светапоглядзе якіх няма прынцыповых адрозненняў.

Чым шырэй мастак ахоплівае аб'ектыўную рэальнасць, тым большае грамадскае і мастацкае значэнне маюць створаныя ім вобразы, але пры ўмове, калі гэтая аб'ектыўная рэальнасць глыбока ім асэнсоўваецца. Бялінскі хваліў Гогаля за тое, што ў "Мёртвых душах" моцная суб'ектыўнасць, але ён абараняў "не тую суб'ектыўнасць, якая па сваёй арганічнасці ці аднабаковасці скажае аб'ектыўную рэчаіснасць ствараемых паэтам прадметаў; але тую глыбокую, усебаковую і гуманную мастацкую суб'ектыўнасць, якая знаходзіць чалавека з гарачым сэрцам, сімпатычнаю душою і духоўна-асабістаю "самасцю", — што суб'ектыўнасць, якая не дапускае яго з апатычнай абыякавасцю быць чужым свету, які ім ствараецца, але застаўляе яго праводзіць праз сваю душу жывую з'яву навакольнага свету, а праз тое і ў іх укладаць душу жывую ... " (5).

Суб'ектыўнасць мастака карэнным чынам адрозніваецца ад суб'ектывізму. Як справядліва падкрэслівае балгарскі эстэтык К.Гаранаў, "нічым не апраўдана такое становішча, калі з-за асцярогі перад суб'ектыўным уседазволам суб'ектыўнасць у мастацтве атаясамліваецца з суб'ектывізмам"(6). Гэтыя паняцці нельга змешваць, як нельга змешваць і аб'ектыўнасць з аб'ектывізмам. Наадварот, гэтыя паняцці ўзаемавыключаюць адно аднаго. Аб'ектыўнасць — спасціжэнне жыцця ў працэсе яго пазнання. Аб'ектывізм жа, як правіла, далёкі ад ісціны і скажае праўду жыцця.

Суб'ектыўнасць і суб'ектывізм таксама выключаюць адно аднаго. Суб'ектывізм — гэта творчая ўсёдазволенасць мастака, скажэнне ім праўды жыцця, нежаданне ці няўменне лічыцца з аб'ектыўнымі законамі рэчаіснасці, з унутранай логікай жыццёвага матэрыялу. Сапраўдны мастак не можа абылгаць жыццё, паказаць яго ў іншых вобразах, а не ў тых, якіх

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

патрабуе логіка развіцця самога жыцця. Шырока вядомае разважанне Л.Талстога аб суб'ектыўным фактары, дзе вялікі пісьменнік спасылаецца на пісьмы А.С.Пушкіна аднаму са сваіх сяброў паводле гісторыі стварэння вобраза Тацляны Ларынай: "Уяві сабе, якую "штуку ўдрала" са мной Таццяна! Яна замуж выйшла. Гэтага я ніяк ад яе не чакаў". І далей заўважае: "Тое ж самае я магу сказаць пра Ганну Карэніну. Наогул героі і гераіні робяць часам такія рэчы, якіх я б не жадаў: яны робяць тое, што павінны рабіць у рэчаіснасці і як адбываецца ў рэчаіснасці, а не тое, што мне хочацца" (7).

Суб'ектывізм вядзе да несапраўдных абагульненняў, ён імкнецца ўціснуць жыццё ў пракрустава ложа зададзенай схемы. Суб'ектывізм не лічыцца ні з характарамі дзеючых асоб, ні з абставінамі жыццёвага асяроддзя. Канфлікты ўзнікаюць не ў выніку даследавання жыцця, а, наадварот, жыццё ненатуральна падганяецца пад прынятыя раней рашэнні. Суб'ектывізм — вынік несапраўдных ідэй, якія разбураюць мастацтва.

Нават моцны і глыбокі талент, падпаўшы пад уплыў суб'ектывізму, рызыкуе цалкам згубіць, або, па меншай меры, аслабіць твор, разбурыць мастацкую цэльнасць вобраза, апынуцца ў палоне бязвыхадных супярэчнасцей. Мастаку нельга знаходзіцца ва ўладзе несапраўдных суб'ектыўных уражанняў. Мастацтва наогул не выносіць падробкі. Моц мастацкага таленту ва ўменні вызваліцца ад памылковых суб'ектывісцкіх уяўленняў, у абвостраным пачуцці праўды, ва ўменні пакарыцца логіцы жыццёвага матэрыялу.

Але даследаванне жыцця, пераўтварэнне яго з'яў у мастацкія вобразы патрабуе вялікай і складанай работы мастака. У суб'ектыўнасці раскрываецца яго творчая актыўнасць, эстэтычная своеасаблівасць, грамадзянскі воблік.

А.М.Горкі пісаў, што "мастак — гэта той, хто можа знайсці агульназначнае — аб'ектыўнае, хто здольны даць сваім уяўленням уласныя формы" (8).

Адзінствам аб'ектыўнага і суб'ектыўнага характарызуюцца не толькі мастацкі вобраз, але і яго ўспрыманне.

Менавіта гэтым тлумачыцца той факт, што ў практыцы мастацтва стварэнне вобраза не заўсёды заканчваецца поўным завяршэннем. У мастацкім творы часта бывае шмат прабелаў, у творы можа быць і не

прадстаўлена дастаткова поўная карціна; калі-нікалі мастак не столькі дае адказы, колькі ставіць пытанні. Але мастак спадзяецца, што абуджэнне мастацтвам уяўлення чалавека дапаможа яму стаць дадатковым творцам. У працэсе ўспрымання вобраз, створаны мастаком, як бы дапрацоўваецца ўяўленнем чытача (гледача, слухача). Ён уносіць у гэты вобраз дадатковыя рысы, надае яму сваё бачанне, пашырае межы адлюстравання. Сапраўднае мастацкае ўспрыманне заўсёды мае актыўны творчы характар. Трэба падкрэсліць, што ўзровень "мастацкасці" вобраза (як і мастацкага твора наогул) абумоўлены дыялектычна супярэчлівым адзінствам тыповага і індывідуальнага, аб'ектыўнага і суб'ектыўнага, рацыянальнага і эмацыянальнага.

---


1.Кемянов В. Против абстракционизма. В спорах о реализме. — М., 1989. — С.7—12.
2.Blanc P. The artist and the atom // Magasine of art. — 1951. — Vol.44, №4. — P.150.
3.М.Горький в воспоминаниях современников. — М., 1965. — С.645 — 650.
4.Стэндаль. Збор твораў: У 15-ці т. — М., 1959. — Т.10. — С. 64.
5.Бялінскі В.Р. Поўны збор твораў: У 13-ці т.— М., 1955. — Т.6. — С.217 — 218.
6.Гаранаў К. Мастацкі вобраз і яго гістарычнае жыццё. — М.,1970. — С.90.
7.Русские писатели о литературе / Сб. — М., 1976. — Т. 21. — С.143.
8.Горький М. Собрание сочинений. — М., 1957.— Т.21. — С.312.


РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ